Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 ЛІСТАПАДА 2016 г. ЧАЦВЕР № 227 (28337)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Грып на парозе

СТАР. 4

Сямейная газета

Дзіцячы садок мары

Сын «падымае руку»...

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір ГУСАКОЎ, старшыня Прэзідыума НАН:

«Сёння ад моладзі чакаюць крэатыўных ідэй і прынцыпова новых рашэнняў актуальных задач прыкладнога характару. У найбліжэйшай і аддаленай перспектыве неабходны ўмовы па фарміраванні ў маладых вучоных даследчых навыкаў. Тут галоўнае — не страціць талент, аказаць дапамогу найбольш перспектыўнай моладзі».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.11.2016 г.

Долар ЗША	1,9514	▲
Еўра	2,0720	▲
Рас. руб.	0,0304	▼
Укр. грыўня	0,0762	▲

ISSN 1990 - 763X

ПАЎНОЧНЫЯ ЎБОРЫ

Дзісенскі Дом рамёстваў Мёрскага раёна займаецца рэканструкцыяй традыцыйнага строю, у які мясцовыя прыгажуні прыбіраліся ў пачатку мінулага стагоддзя. Над праектам па адраджэнні народнага ўбору працуюць дырэктар установы Алена БАЛАШ разам з майстрамі Людмілай ГАНЕБНАЙ і Яўгеніяй КОЗЕЛ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Культура ў «лічбе»

КАЛІ ЭКСКУРСАВОД — СМАРТФОН

Мабільны дадатак дазваляе віртуальна прагуляцца па Брэсцкай крэпасці

Сёння, каб пабываць у мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой», неабавязкова ехаць на легендарную брэсцкую зямлю. Бясспрэчна, гераічную цытадэль мусіць наведаць кожны нашчадак пакалення пераможцаў, але адпаведныя магчымасці ёсць не ва ўсіх. Праўда, і тым, хто там ужо пабываў, часам хочацца вярнуцца, бо, як заўсёды, то недагледзеў, то недачуў, то не ўсё зразумеў...

Брэсцкая крэпасць па-ранейшаму з'яўляецца адным з самых папулярных аб'ектаў у жыхароў і гасцей Беларусі. Цяпер стала магчымым апынуцца там у любы час, знаходзячыся ў любым месцы краіны. Спампаваўшы (прычым бясплатна!) на свой гаджэт мабільны дадатак «Брэсцкая крэпасць. Схаваная гісторыя», у рэжыме «афлайн» можна пазнаёміцца з гісторыяй 60 аб'ектаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі комплексу, убачыць звыш 200 архіўных і сучасных фотаздымкаў, а таксама самастойна павандраваць па малавядомай частцы крэпасці.

СТАР. 4

■ Здаровае харчаванне

ЗАМЕСТ ВІНАГРАДУ І ПЕРСІКАЎ — БУРАКІ І ЦЫБУЛЯ

Лепш ужываць тое, што расце на сваёй зямлі

Недахоп энергіі, якая атрымліваецца з ежай, дэфіцыт спажыўных рэчываў і мікраэлементаў, у тым ліку жалеза, ёду і вітаміну А, а таксама хуткі рост колькасці людзей з лішняй вагой — галоўныя сусветныя праблемы ў дакладах экспертаў апошняй сесіі Камітэта па сусветнай харчовай бяспецы. У ідэале любая краіна павінна імкнуцца да таго, каб у кожнага чалавека пастаянна быў фізічны, сацыяльны, эканамічны доступ да дастатковай колькасці бяспечнай і спажыўнай ежы, якая задаволіць харчовыя патрэбы, смакавыя перавагі, дазволіць падтрымліваць актыўны і здаровы лад жыцця.

Паводле слоў **загадчыцы сектара харчовай бяспекі Інстытута сістэмных даследаванняў у аграпрамысловым комплексе Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдата эканамічных навук Святланы КАНДРАЦЕНКІ**, наша краіна адносіцца да катэгорыі краін з вельмі нізкай, менш за 5 працэнтаў, удзельнай вагой насельніцтва, якое недаядае, — нароўні з краінамі ЕС і Паўночнай Амерыкай. (У рэйтынгу The Economist Intelligence Unit Беларусь займае 46-е месца з 113 дзяржаў.) У Беларусі ўзровень разнастайнасці рацыёну харчавання ацэньваецца ў 75 са 100 балаў, дастатковасць харчавання на ўнутраным рынку — у 81 бал, развіццё сельскагаспадарчай інфраструктуры — у 42. Сярод нашых слабых бакоў — высокі ўзровень расходаў на харчаванне, недастатковы ўзровень дзяржаўных расходаў на сельскагаспадарчыя даследаванні і распрацоўкі, адсутнасць апублікаванай нацыянальнай стратэгіі павышэння якасці харчавання.

За кошт уласнай вытворчасці мы задавальняем патрэбы ўнутранага рынку ў малацэ і малочных прадуктах на 220 працэнтаў, мясе і мясных прадуктах — на 134, яйках — на 129, цукры і алеі — на 180 і 120 працэнтаў адпаведна. Разам з тым доля некаторых імпартных прадуктаў на спажывецкім рынку застаецца неабгрунтавана высокай. Беларусы спажываюць да 90 працэнтаў імпартных фруктаў, гародніны — 26, рыбы — 53, фруктовых сокаў і сокаў з гародніны — 28, алею — 76, дзіцячага харчавання — 33 працэнты.

СТАР. 4